# 40 гадоў пасля Чарнобыля:

# ад асабістага досведу да калектыўнай памяці

**Дыскусія**
**15.04.2026**
**18:00-19:30 (Берлін)**
**19:00-20:30 (Мінск)**

Дыскусія адбудзецца на беларускай і англійскай мовах з сінхронным перакладам.

Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

Форум гістарычных даследаванняў Беларусі
Forum für historische Belarus-Forschung

**Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы: https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_ISjSJD0qTUKiH6QIbfLu9Q**

Катастрофа 1986 года ў Чарнобылі стала часткай транснацыянальнай гісторыі і паўплывала на жыццё многіх грамадстваў. Вайна Расіі супраць Украіны зноў актуалізавала памяць пра Чарнобыль і праблему бяспекі.

Мы абмяркуем, якія вобразы катастрофы і жыцця пасля яе замацоўваюцца зараз ў грамадстве Беларусі, а якія застаюцца маргіналізаванымі, і як на гэты працэс уплываюць дзяржаўная палітыка, навука і культурныя практыкі. Важным аспектам стане таксама пытанне пра тое, як Чарнобыль працягвае прысутнічаць у ідэнтычнасці людзей, народжаных ужо пасля катастрофы. У дыскусіі наша ўвага будзе сканцэнтравана і на прыкладах таго, як змянілася жыццё перамешчаных асоб, а таксама дзяцей, якія ўдзельнічалі ў міжнародных гуманітарных праграмах за межамі Беларусі.

Дыскусія закране і транснацыянальнае вымярэнне памяці пра Чарнобыль: як розныя краіны і супольнасці інтэрпрэтуюць гэтую падзею і якія формы салідарнасці ўзніклі ў яе выніку, ці сфармаваліся агульныя рамкі разумення катастрофы.

## Мадэрацыя

**Аляксей Братачкін**
Дыстанцыйны Універсітэт у Хагене, Германія

## Эксперткі ды эксперты

**Дэвід Роджэр Марплс**
Універсітэт Альберты, Канада
**Юля Цімафеева**
Паэтка і перакладчыца, Берлін

## Уводзіны

**Габрыэле Фрайтаг**
Нямецкае таварыства па даследаванні Усходняй Еўропы